## РОЛЯ ГУЛЬНЯВЫХ МЕТАДАЎ У ФАРМІРАВАННІ САЦЫЯЛЬНА-АСОБАСНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ

**Аляксандраў У.Л. (Рэспубіка Беларусь, Мінск, БДУІР)**

У шырокім сэнсе гульнявым будзем лічыць любы элемент навучання, у якім прысутнічае хаця б адна з наступных прыкметаў: 1) суперніцтва, спаборніцтва навучэнцаў; 2) умоўная сітуацыя (імітацыя, інсцэніроўка, трэнінг). У чым каштоўнасць навучальных гульняў? У тым, што яны, забаўляючы, істотна спрашчаюць дасягненне асноўных мэтаў адукацыйнага працэсу: навучанне, выхаванне і развіццё асобы. Калі казаць больш разгорнута, гульня: 1) спрыяе развіццю камунікатыўных уменняў і навыкаў, здымае бар’еры ў зносінах, выступах, адказах; 2) фарміруе псіхалогію пераможцы і такім чынам задае моцную матывацыю на паспяховае навучанне і працу, бо прайграваць ніхто не любіць; 3) спрыяе, як і ўсякае спаборніцтва, умацаванню валявых якасцяў асобы (настойлівасць, вытрымку); 4) падтрымлівае дзякуючы сваёй варыятыўнасці і непрадказальнасці інтарэс да занятку, выступаючы атныподам сумнай і аднастайнай працы; 5) стварае спрыяльную (разняволеную, добразычлівую, даверлівую) атмасферу; 6) спрыяе зняццю напружанасці, стомленасці, нярвовасці; 7) развівае арганізатарскія і дзейнасныя ўменні і навыкі (праца ў камандзе, пастаноўка агульных мэтаў, размеркаванне ролей, пошук кампрамісаў, прыняццё рашэнняў і іх выкананне); 8) стымулюе развіццё важных здольнасцяў мыслення і рысаў характару (уяўленне, фантазія, аналіз, пачуццё гумару, знаходлівасць і інш.).

У той жа час нельга перабольшваць ролю і магчымасці гульнявых метадаў навучання. Для паспяховага прымянення ў навучальным працэсе гульня павінна быць: 1) дарэчнай (напрыкдад, лепей яе праводзіць на занятках абагульнення і замацавання, чым пры выкладанні новага матэрыялу); 2) стрыманай (не варта займаць ёй усю пару); 3) падрыхтаванай (з пісьменна падабранымі заданнямі, спланаваным і арганізаваным месцам і часам, сфармуліраванымі правіламі, размеркаванымі ролямі і г.д.); 4) разнастайнай (па характары заданняў і спосабам працы, фарміруемым уменням, правяраемым ведам); 5) карэктнай (у навучальнай, як і любой іншай, гульні неабходна прытрымлівацца прынцыпаў справядлівасці, роўнасці, сумленнасці); 6) эфектыўнай (і выкладчык, і навучэнцы павінны бачыць і фіксіраваць карысць, рэальна дасягнуты станоўчы вынік).

Якія элементы навучальнага матэрыялу і навучальнага працэсу могуць быць выкарыстаны? Па-першае, можна ўказаць на гульнявую працу з паняццямі і тэкстамі (вучэбнымі і навуковымі). Напрыклад, гэта складанне і (або) разгадванне загадак, анаграм, красвордаў; творчы пераказ ці інтэрпрэтацыя (вершам, песняй, малюнкам, сцэнкай); конкурсы на лепшыя пытанні, адказы, тлумачэнні; пошук лішняга, патрэбнага, памылак, суадносінаў, агульнага, супрацьлеглага і г.д. Формай для дадзеных прыёмаў могуць быць вядомыя тэлевізійныя інтэлектуальныя гульні (―Брэйн-рынг”, ―Свая гульня”, ―Адзін супраць усіх”, ―Разумнікі і разумніцы”), канечне, змененыя і прыстасаваныя да мэтаў і ўмоваў канкрэтнага занятку. Па-другое, вялікае поле для творчасці дае гульня як метад абмеркавання і магчымага вырашэння праблем (светапоглядных, маральных, палітычных, прававых і інш.). Напрыклад, гэта інсцэніроўка філасофскіх, рэлігійных, навуковых дыспутаў; мадэліраванне розных сацыяльных, палітычных, эканамічных, прававых сітуацый і праблем з прапановай магчымых варыянтаў іх вырашэння. Чым адрозніваецца мадэліравнне ад простага абмеркавання? Тым, што ўдзельнікі ―уваходзяць у ролю”, асабіста паглыбляюцца ў сутнасць праблемы. Гэты погляд суб’ектыўны і зацікаўлены, але менавіта ён дапамагае фарміраваць сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі навучэнцаў, а таксама іх прафесіянальныя і маральныя якасці.

## ПАРАДАКСАЛЬНАЕ МЫСЛЕННЕ І ЯГО ЗНАЧЭННЕ Ў КАНТЭКСЦЕ ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ВЫШЭЙШАЙ ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

**Бабко А.І. (Рэспубліка Беларусь, Мінск, БДУКМ)**

Да найважнейшых фактараў развіцця тэхнікі, якое набывае ў гісторыі чалавецтва ўсё большае значэнне і ўсё больш інтэнсіўны характар, належыць уласцівае ёй творчае

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вымярэнне. Тэхніка выступае як неад'емны і паўнапраўны кірунак крэатыўнай чалавечай дзейнасці. Яе прыцягальнасць (і гэта датычыць, безумоўна, не толькі тэхнічнай творчасці) абумоўліваецца ў вельмі істотнай ступені тым, што, ствараючы штосьці прадметнае, знешняе, чалавек творыць разам з тым і самога сябе. Творчыя паводзіны, аднак, звязаны з пэўнымі перадумовамі, яны патрабуюць дастаткова трывалага падмурка (і ў індывідуальным, і ў сацыяльным плане). Значыцца, той, хто імкнецца здзейсніць сябе у дадзенай сферы як творца, а не як эпігон-рамеснік, павінен рыхтаваць сябе да гэтага – развіваць свае крэатыўныя схільнасці і здольнасці, няўхільна ўзмацняць свой творчы патэнцыял. Такім чынам, надзейная аснова для крэатыўнай дзейнасці не можа паўстаць без інтэнсіўных духоўных намаганняў адпаведнай асобы. Відавочна, што ўсебаковае спрыянне гэтай духоўнай працы належыць да кола найгрунтоўнейшых задач, якія павінна вырашаць сучасная, эфектыўная, дынамічная сістэма вышэйшай тэхнічнай адукацыі.

Сярод сродкаў, што могуць быць эфектыўна задзейнічаны ў розных сегментах адукацыйнага працэсу пры вырашэнні згаданай задачы, варта адзначыць стварэнне праблемных, складаных, ―парадаксальных" пазнавальных сітуацый. У навуковай літаратуры (асабліва ў англасаксонскай) тэрмін ―парадокс" знаходзіць дастаткова шырокі ўжытак, сфера якога зусім не абмяжоўваецца логікай і матэматыкай (тэорыяй мностваў). І гэта не выпадкова, бо ўмовы, што змушаюць да парадаксальнага мыслення, могуць скласціся на любым кірунку духоўнага пошуку. Парадокс у дадзеным кантэксце можна азначыць як супярэчнасць, што ўзнікае з фармальна правільных разважанняў. Парадаксальнае мысленне ва ўсіх яго формах (апарэйтычнай, антынамічнай, разгорнутай у дыскурс адпаведнага кшталту) неабходным чынам звязана з вострымі крызісамі і калізіямі, і таму кінуты ў небяспечную яго стыхію чалавечы дух міжволі імкнецца да новых, нестандартных падыходаў і рашэнняў.

Парадокс выяўляецца як важны сродак эфектыўнай арганізацыі адукацыйнага працэсу ў тэхнічных ВНУ і з пункту гледжання фарміравання ў будучых спецыялістаў сацыяльных кампетэнцый. Відавочна, што згаданы працэс павінен нацэльваць студэнтаў на актыўнае і творчае іх засваенне. Аснова для артыкуляцыі крэатыўнага аспекту ў дадзеным кантэксце задаецца праз усведамленне таго факта, што тэхнічная творчасць выступае як неад'емны кірунак сацыяльнай творчасці, культуратворчасці ўвогуле і што ва ўсіх выпадках узровень сапраўднай крэатыўнай дзейнасці можа быць дасягнуты толькі на грунце высокіх гуманістычных прынцыпаў – інакш творчая дзея парадаксальным чынам ператвараецца ў сваю супрацьлегласць, у разбуральны акт.

На жаль, каб змадэляваць парадаксальную сітуацыю, якая змусіла б студэнтаў засяродзіцца на неабходнасці гуманізацыі грамадскага жыцця і ўсіх яго сегментаў, у тым ліку і тэхнікі, патрэбы ў значных інтэлектуальных намаганнях няма. Справа ў тым, што чалавецтва знаходзіцца сёння менавіта ў такой – складанай, парадаксальнай – сітуацыі. Яе разгортванне пераканаўча паказвае, што тэхнічныя інавацыі мусяць быць арганічна спалучаны з сацыяльнымі пераўтварэннямі, асвячонымі высокай духоўнасцю, і што адпаведная інтэнцыя павінна зрабіцца імператывам для кожнага творчага чалавека, у тым ліку інжынера ці вынаходніка.

Творчыя паводзіны нельга запраграмаваць, падаць у схемах і алгарытмах, даступных для завучвання. Эфектыўныя адукацыйныя сістэмы, у тым ліку і сістэма вышэйшай тэхнічнай адукацыі, могуць і павінны, аднак, паспрыяць абуджэнню творчых памкненняў студэнтаў і развіццю іх творчых здольнасцяў. Значны крэатыўны патэнцыял парадаксальнага мыслення ні ў якім разе не павінен быць праігнараваны ў адпаведным працэсе.

## ФИЛОСОФСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ КАК СТИМУЛ ВОЗРОЖДЕНИЯ ГУМАНИЗМА

**Володин В.М. (Республика Беларусь, Минск, БГУИР)**

«Без знания истории философии, без изучения оригинальных текстов создателей новых философских идей, концепций, систем, без понимания того, как исторически развивалось философское знание, невозможно стать философом» [1]



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ